**Крук І.І.,** *дацэнт*

# НАРОДНАЯ КУЛЬТУРА Ў НОВАЙ ПАРАДЫГМЕ АДУКАЦЫІ

Паліталогія, сацыялогія, гісторыя цывілізацый, культуралогія, гісторыя рэлігій свету, беларусазнаўства - што за новыя знакі на нашым шляху рэфармавання нацыянальнай сістэмы адукацыі? Чарговыя выверты нашай пластычна-бесхрыбетнай свядомасці, якую ў XX стагоддзі бясконца і бессаромна зашлакоўвалі дэмагагічнымі лозунгамі і ў рэшце рэшт знясілілі так, што яна ў аморфнасці сваёй успрымае любыя навацыі як чарговую порцыю ўсенароднага наркотыка. Ці ўсё-такі ёсць больш-менш сур'ёзная спроба раз і назаўсёды вызваліць нашу сферу адукацыі ад ідэалагічнага сепарыравання і апладатварыць яе сапраўднай усебаковай гісторыяй сусветнай цывілізацыі, а затым ажывіць гэты эмбрыён аб'ектыўнай карцінай духоўных пошукаў найбольш слынных яе сыноў і дачок? Улічваючы тое, што корпус педагагічных кадраў у большасці сваёй застаўся той самы і што стэрэатыпы свядомасці трымаюць асобу мацней, чым чыгуначныя рэйкі лакаматыў, дапускаць можна ўсякае: і простую змену шыльдаў, і спробу для саміх сябе знайсці сілу і зазірнуць у тыя таямніцы зямнога суіснавання, якія раней былі надзейна прыхаваны ідэалагічнай цэнзурай. Адной з самых моцных і найбольш пашыраных ідэалагем сучаснасці стала інтэнсіўная фетышызацыя культуралогіі. Пакуль што ніхто не можа дакладна вызначыць ні прадмет яе даследавання, ні асэнсаваць параметры змястоўнага, сэнсавага і семіятычнага кантынуума, ні ахарактарызаваць статуснага поля ў кантэксце філасофіі, гісторыі культуры і цывілізацыі, але затое ўсе бравіруюць гэтым харызматычным паняццем да месца і не зусім.

На наш погляд, на сучасным этапе станаўлення культуралагічнай думкі на Беларусі і ў навукова-тэарэтычнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасторы постсавецкага пояса пераважаюць тры мадэлеўтваральныя імператывы.

Першы з іх, адзін з найбольш ранніх, міфалагічных, зыходны культуратворны прынцып эпохі першатварэння свету, які дакладна ўвасоблены ў рытуалаформе-міфалагеме «ўсё вяртаецца на кругі свае». На гэтым прэдыкаце трымаецца архітэктоніка народнай казкі: ініцыяльная форма з абавязковай фіксацыяй адвечнага «жылі-былі», затым канфліктная сітуацыя з трохразовай рэтардацыяй яе вырашэння і, нарэшце, сакралізаваны фінал: «сталі жыць-пажываць і дабра нажываць». Менавіта таму сімвалам бясконцасці Сусвету і часу той эпохі была змяя, якая паядае свой хвост.

Другім імператывам з'яўляецца тэзіс, на якім грунтуецца ўвесь марксізм і які дагматызавалі савецкія філосафы: «Усё ў свеце развіваецца па спіралі». Адразу ж адзначым,што маем справу з тым самым, але крыху мадэрнізаваным тэзісам. Культуролагі і філосафы гэтай папуляцыі разарвалі кола як сімвал замкнёнай сістэмы і пачалі раскручваць спіраль, пры гэтым узялі за аснову не мадэль устойлівай егіпецкай піраміды, для якой нават час не страшны, а яе перавернуты антыпод, скалькіраваўшы пры гэтым адну з астрафізічных тэорый, якая сведчыць, што Сусвет утварыўся ад першаўзрыву ядра, маса якога перавысіла крытычную адзнаку.

Трэцім гісторыка-культуралагічным імператывам, трэцім варыянтам ідэі развіцця была і застаецца спроба не проста разарваць кола, пашырыць яго і ўзняць на новы віток, а выпраміць яго і задаць аднанакіраваную дынаміку, адпраўным пунктам якога з'яўляецца Раство Хрыстова. Аднак і гэтая, здавалася, бясконцая ў часе перспектыва раз-пораз натыкаецца на ідэю «канца свету» або «другога прышэсця Хрыста» з не зусім зразумелай карцінай далейшага існавання. Але такі філасофскі канцэпт значна выходзіў за межы жыцця аднаго пакалення, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таму зямное існаванне мыслілася як мікрафаза на пераходзе ў вечнае замагільнае існаванне. Чарговая спроба матэрыяльнага ўвасаблення гэтай ідэі абудзіла канструктарскую думку і візантыйскіх , і рымскіх архітэктараў скапіраваць тыя ж егіпецкія піраміды і ўзвесці вельмі падобныя да іх храмы. Праўда, у адрозненне ад пірамід, у сярэдзіну якіх, бы ў «той свет», маглі трапляць толькі жрацы, у храм дазваляецца заходзіць амаль што ўсім жывым. Хаця і тут ёсць свае абмежаванні. Космас храма падзелены на дзве часткі. У адной з іх дазваляецца прысутнічаць усім, заходзіць у другую ў час набажэнства маюць права толькі святары.

Менавіта вакол гэтых філасофскіх мадэляў вядзецца пошук стварэння сучасных мадэляў культуралагічнай падрыхтоўкі ва ўсіх звёнах сферы адукацыі і прадпрымаецца спроба напаўнення гэтай мадэлі адпаведным зместам з яго міжструктурнай (дзіцячыя дашкольныя ўстановы--школа--ВНУ) і ўнутрыструктурнай (міжкурсавой) стратыфікацыяй. Зразумела, што ў вышэйпрыведзеным тэзісе сканцэнтравана асноўная ідэя сучасных пошукаў, якая, у сваю чаргу, ставіць на мэце рашэнне дзвюх непадзельных задач: адрэфлекціраваць сучасную сітуацыю культуралагічнай падрыхтоўкі ў вышэйшай школе і прамадэліраваць наступны крок у гэтым накірунку, памятуючы нашу сакральную трыяду: каго вучыць, чаму і як.

Думаецца, што на дадзеным этапе больш канструктыўны характар можа мець гаворка аб уласна культуралагічных аспектах з улікам педагагічнай дамінанты «чаму вучыць». Адразу ж за гэтым удакладненнем неабходна зрабіць яшчэ адну агаворку. Аб'ектам нашага даследавання будзе месца этнічнай культуры ў сістэме культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў ВНУ. Пайсці такім шляхам прымушаюць наступныя акалічнасці.

Тыя тры філасофскія мадэлі, пра якія гаворка ішла вышэй, моцна ўплываюць на фарміраванне структуры базавых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуралагічных курсаў як у сярэднім, так і ў вышэйшым звяне адукацыі. Што маецца на ўвазе? Уся сістэма каштоўнасцей савецкай дзяржавы і адпаведна савецкай школы трымалася на інтэрнацыянальных прыярытэтах. Таму, безумоўна, у той сітуацыі гаварыць пра сістэму нацыянальных каштоўнасцей было проста немагчыма.

Сучасныя спробы мадэліравання культуралагічных блокаў нагадваюць (калі не цалкам паўтараюць) пошукі савецкіх філосафаў. Справа ў тым, што на сённяшнім этапе станаўлення нацыі беларускі народ не мае свайго духоўнага Маісея, які б змог аб'яднаць усіх адзінай этнакансалідуючай ідэяй і павесці за сабой, ды і гісторыя не падаравала нам 40 гадоў, каб на прыкладзе жыцця двух новых пакаленняў выбіць з нас колішнія штучныя стэрэатыпы. І тады, натуральна, пачнецца філасофска-культуралагічная мімікрыя ў жорсткіх межах усё таго ж пракрустава эталона. У выніку нараджаюцца неверагодныя духоўныя маргіналіі.Тыя, хто сёння называюць сябе культуролагамі, як не ведалі глыбока духоўную спадчыну беларускага народа, так і не ведаюць. І тады замест добра знаёмай ідэалагемы савецкай эпохі «інтэрнацыянальная культура» пайшлі гуляць дакладна неасэнсаваныя «агульначалавечыя каштоўнасці».

Замест цэласнага, сістэматызаванага, структурна ўпарадкаванага, сінкрэтычнага па зыходнай задуме курса «Беларуская культура» — чарговы неалагізм «Сусветная мастацкая культура». Няхай сабе і так. Але наколькі шырока і як глыбока прадстаўлена ў гэтым курсе наша родная спадчына? Замест колішняга курса «Навуковы атэізм» сёння выкладаецца «Гісторыя рэлігій свету». На максімалізм захварэлі і шматлікія нашы гісторыкі , якія зблыталі геаграфію з гісторыяй і культурай і актуалізавалі чарговую беспадстаўную дэкларацыю: мы высокацывілізаваны народ, бо, маўляў, жывём у цэнтры Еўропы. Пры гэтым яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забываюць глянуць на сітуацыю з супрацьлеглага боку: знаходжанне паміж двума полюсамі (вялікімі культурамі) прывяло да таго, што мы апынуліся на гістарычным зломе, дзе сышліся праваслаўе і каталіцызм, якія з цягам часу прывялі да фарміравання розных тыпаў ментальнасці, самасвядомасці, рэлігійнай актуальнасці.

Усе гэтыя культуратворныя імператывы, безумоўна, маюць гістарычную перспектыву, і ніхто не ставіць пад сумненне іх творчы патэнцыял. Аднак для таго, каб весці з Еўропай раўнапраўны дыялог у галіне культуры, трэба паважаць цывілізаванага партнёра, выкладваючы больш салідныя аргументы, а не пацяшаць яго маскультурнай трансформай традыцыйнага фальклору.

Прайшло ўжо даволі шмат часу з той пары, калі ў нашых ВНУ пачаліся прынцыповыя змены ў структуры і змесце адукацыі. Культуралогія паступова фарміруецца ў цэласную, выразную, лагічна ўнарадкаваную з'яву. Аднак ні ўвядзенне ў структуру ВНУ кафедраў беларусазнаўства або гісторыі беларускай культуры, ні пэўнае пашырэнне курсаў фальклору або міфалогіі пакуль што не ўнеслі прынцыповых змен у сутнасць пастаўленай праблемы. Беларуская культура як была фрагментарна прадстаўлена ў адзіным культуралагічным курсе, такой яна і засталася.

На чым грунтуюцца гэтыя высновы? На вопыце работы з сацыякультурным прадуктам дзейнасці ВНУ — з іх выпускнікамі, якія праходзяць павышэнне кваліфікацыі ў ІПК як сферы адукацыі, так і сферы культуры. Шматлікія дыягнастычныя зрэзы, анкетаванні, навукова-практычныя канферэнцыі, «круглыя сталы», панарамы вопыту, курсавая і індывідуальная працы, спробы праектавання рэгіянальных мадэляў традыцыйных рытуальна-абрадавых комплексаў адназначна сведчаць: веданне духоўнай спадчыны бездапаможна мізэрнае і абсалютна не

зарыентавана на рытуальную практыку як гадавога колазвароту, так і жыццёва-сямейнага цыкла.

Працэс актуалізацыі традыцыйнай народнай культуры, які пачаўся на Беларусі некалькі гадоў таму, аказаўся надзвычай складаным і супярэчлівым. Каб разумець прычыны гэтага, неабходна паспрабаваць нам,сучаснікам мяжы двух стагоддзяў і тысячагоддзяў, асэнсаваць глыбінную сутнасць народнай культуры, яе філасофію, эстэтыку, этыку, спасцігнуць галоўныя прыярытэты, выглумачыць сістэму маральных каштоўнасцей, уявіць яе цэласнасць і — самае важнае — месца і ролю ў жыцці грамадства.

Асноўным артэфактам духоўнай спадчыны беларусаў з'яўляецца ўзвышэнне Роду ў яго міфалагічнай рэтраспектыве і гістарычнай перспектыве. Мікракосм зыходнай сацыяльнай адзінкі быў арганічна ўпісаны ў макракосм народнага календара. Практычна ў кожным гадавым святе былі рытуальныя адзенні, сюжэтныя хады ў развіцці абрадавага комплексу, якія былі скіраваны на ўшаванне Роду. Разам з тым уяўляецца, што народны каляндар як цэласная,разгалінаваная, структурна ўпарадкаваная сістэма сацыякультурных арыентацый нашых продкаў пакуль што не атрымаў належнай навуковай ацэнкі. Беларускія этнакультуролагі анатаміравалі яго, падзялілі на цыклы, перыяды, этапы, канкрэтныя святы, але пакуль што не ўбачылі яго як адзінае цэлае, як універсальную сістэму каштоўнасцей, у рэчышчы якой фарміравалася нацыянальная мадэль сусвету, ментальнасць, экспрэсія мастацтва, інстытуты сацыялізацыі асобы.

Адсутнасць магчымасці цэласнага ўспрымання народнай культуры сучасным пакаленнем моладзі прыводзіць да прынцыповых змен у яе сённяшнім існаванні. Для Беларусі, як і для большасці постіндустрыяльных краін, характэрна агульная тэндэнцыя: традыцыйная культура паступова дэсакралізуецца, у шырокай масавай свядомасці яна даўно страціла глыбінны

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

магічна - рытуальны сэнс і спакваля ператвараецца ў адну з разнавіднасцей масавай культуры.

Разарванасць, несістэмнасць успрымання духоўнай спадчыны, характэрная для гісторыі нашай культуры ў XX стагоддзі, па сутнасці, прыводзяць да стварэння новай культурнай парадыгмы, якая ўяўляе нейкае інферальна-маргінальнае гвалтаванне, бессэнсоўны кангламерат, які ўвабраў у сябе абсалютна рознастадыяльныя і рознарэгіянальныя рэчы. Культуралагічны парадокс гэтай сутнаснай трансмутацыі заключаецца ў тым, што адбываецца перакадзіроўка поля абрадавай атрыбутыкі, утылітарна-практычнай і сакральна-магічнай сімволікі, звужаецца, збядняецца да прымітыўнасці функцыянальны спектр некалі жорстка дэтэрмінаваных рытуалаў.

Яшчэ раз паўтаруся: агульнасусветная і, найперш, агульнаеўрапейская тэндэнцыя ў эвалюцыі народнай культуры зводзіцца да таго, што яна наступова дэсакралізуецца і прынцыпова змяняе сацыяльна-рэгламентуючы статус. Са з'явы, якая вызначала паводзіны членаў сям'і і Роду, рэгламентавала, карэліравала іх гаспадарчую дзейнасць, уплывала на стылістыку танцаў, экспрэсію гульняў, арнаментальную сюжэтыку дэкору сялянскага жылля, прадвызначала асаблівасці этнічнага менталітэту, стэрэатыпы мужчынскіх і жаночых паводзін, народная культура ператвараецца ў экзатычна рэліктавы элемент эстэтызацыі сучаснай тэхнічнай прасторы. Некалі складаны, разгорнуты ў строгай сістэме прасторава-часавых каардынат рытуал спрошчваецца за кошт самай змястоўнай кампаненты — сакральна-магічнай накіраванасці — і ператвараецца ў фалькларызаваную гульню.

А таму нашай звышзадачай на гэты час можна назваць толькі адно: утрымаць дынаміку гэтага разбуральнага працэсу на самым нізкім узроўні ў маштабах усёй рэспублікі і адначасова, па магчымасці, стварыць у кожнай ВНУ эксперыментальна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчую зону самай актыўнай падтрымкі аўтэнтычнай традыцыі на дзяржаўна-прававым узроўні. Фальклорна-этнаграфічныя гурты аўтэнтычнай арыентацыі павінны стаць нацыянальным эталонам духоўнасці, якія не дасць канчаткова дэградзіраваць нацыі ў сітуацыі татальнай агрэсіі кітчавага мастацтва, «замбіраванне» якім актыўна вядзецца праз сродкі масавай інфармацыі.

Актуальнасць захавання нашай народнай спадчыны ўзрастае з кожным днём, яна патрабуе шчырага бацькоўскага клопату, дакладных праграм нашай дзейнасці на блізкую і аддаленую перспектывы.

Відаць, наспела пільная патрэба ў любым культуралагічным курсе ў ВНУ. Трэба хаця б у якасці паралелі або гістарычнага фону знаёміць студэнтаў з нашымі рытуальна-абрадавымі комплексамі, з іх глыбінным сэнсам, з сутнасцю сімволікі народнай культуры, са светапоглядной сістэмай народнай педагогікі, цесна пераплятаючы не толькі фальклорную культуру, але і народнае дойлідства, дэкаратыўна -прыкладное мастацтва і інш. Нашы нашчадкі шчыра аддзячаць нам за гэты пачэсны клопат. Трэба, каб кожная лекцыя, кожны семінар сталі жывым помнікам нашаму багатаму шчырасцю душы народу, свайму роду, сваёй сям'і, кожнаму з нас.

**Смолік А.І.,** *дацэнт*

## ГІСТАРЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ — САСТАЎНАЯ ЧАСТКА САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

З пачатку 90-х гадоў у ВНУ рэспублікі пачалі ўкараняцца новыя вучэбныя дысцыпліны, якія ўжо даўно вывучаюцца ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ